Віка ТРЭНАС

З кнігі

# Цуд канфіскаванага дзяцінства

KAMUNIKAT.org

Логвінаў 2005

***
даруй грахі мне, чужая сьвятасьць,
сьвятло, прывабленае вагнём,
у вочы гледзячы вінавата,
упалы лашчыць цябе анёл.
а недзе ў нечых прыгожых снох
наплакаў возера зор трысьнёг.

***
Няма нічога.
Ёсьць толькі колер тваіх вачэй.
Маўчаньне робіцца ўсё званчэй,
Вясновы ветрык як цёплы дотык.
Няма брыдоты.
Адно аблокі бягуць хутчэй,
Зямная крыўда зь нябёс цячэ,
Я пазбаўляюся сноў употай,
Што будуць потым.

***
мой самотны задумлівы смех
засынае пад гушканні ветру
і зямлю працінае снег
і святлу далёка да свету
праспявай манатонны матыў
толькі ты толькі ты толькі ты

***
ап’янелы ад суму паэт любаваўся сабой
ён вясновым дажджом па старонках чужых пацячэ
ты абернешся болем і табою абернецца боль
цалавацца з пустэчай нахабных вачэй
каб запомніць змярцвелыя рухі забітай душы
каб знайсці, дзе са шчырасцю ейнай знікае зіма
дзе чароўныя сны не імкнуцца цябе задушыць
пошук шляху туды, дзе нікога няма

***Я ў краіне цудаў***
чэзьлі вочы ад вясновае вабноты
навастрыў свае шыпы калючы сьнег
ўсё сумнеўнае магчыма па вясьне
нечпадзеўку гэты сьвет прысьніцца мне
ажывае мёртвы сьлед ды толькі зноў ты
не захочаш пазбаўляцца адзіноты
з ласкі ветру думак колішніх павеў
зьзяе ранішняй расою на траве
і блукае па лязе гітарных вен
разам з пальцамі сумнеў і стогнуць ноты

***Анёлу. Брату***
У сэрцы Бога, быццам кроў, пульсуюць душы. Успамінаў
Праданы смех, і за Нішто ў вачах чужых ізноў загіну.
Бягуць дажджы, і кроплі слоў – палонныя на доўгіх вейках.
З’явіўся час, любі сябе, шукай сябе – у новых леках,
У новых снох. Пакуль ты спіш, Бог з неба разлівае слоту.
Любіць цябе. Шукаць цябе.Укрыжаваць сваю самоту.

***Памяці Андруся Белавокага***
ператвары ў мае слёзы гэтую смерць
я буду біцца з жыццём я буду гарэць
танклявая свечка ў руках паўночных вятроў
крываўлю вусны свае, фарбуецца кроў
у колер бясхмарных нябёс, і скрыўлены жах
бяжыць па вясновай траве як па вострых нажах
калі ты дазволіш вятрам у душы аслабець
ён прыйдзе каб больш не пакінуць ніколі цябе

***Тужлівая балада***
Паэтка параненым зьверам глядзіць на вясну
Маўклівыя дзьверы цябе не пакінуць адну
Дождж крапае часта сьлязьмі невыноснага шчасьця
Ты млееш ад шчасьця такое здараецца часта
Калі за вакном зграбны клён, расхістаны і голы
Пяе непрыстойныя песьні, ты слухаеш голас
Табе падаецца, ахвяра хваробы і стомы,
Што ён да драбнюткае ноты знаёмы знаёмы
Праменьчык, засохлы ад слоты, зьнясілены – ты
Зіхоткай вясёлкай падхопіш няхітры матыў

***
ссівелыя вейкі твае прымрояцца ў сне
сарвецца душа з ланцуга схуднелага цела
ізноў на далонях маіх заспявае снег
зноў нечая ціша абернецца цішай суцэльнай
параняцца вусны аб вусны, і позіркам воўчым
сустрэне забойцу анёл – вочы ў вочы

***Ловы***
Мною дыхаюць сьцены. Боль сьвідруе паветра.
Забывайся на позіркі-дотыкі. Вета.
Ад маіх пацалункаў атруцяцца словы
Пачынаюцца ловы пачынаюцца ловы

***
у роспачы ламаю крылы
нашто анёлу іх расціць
калі да д’ябла ці магілы
і так магчыма дапаўзці

ты апрытомнееш ад ранаў
прымройся ў шэрым сне, малю
мы будзьма, як надыдзе ранак
крыламі біцца аб зямлю

***Белы бэз***
маркотны вершык ціўкае ласкава
мой белы бэз забіты згорклай кавай
паэт аб кнігу вострыць кіпцюры
усе сцяжыны не вядуць у Рым
не будзе болей сонца прамянець
усе дарогі прыйдуць да мяне

***
Чытаюць вершыкі. Бяруць адбіткі пальцаў,
Каб бессаромна рагатаць у цішыні.
Пялёсткі з ружаў пачынаюць асыпацца.
Мы не адны.
Спяваюць дрэвы. Мне не чутны пошчак птушак,
Я бы ў пустэльні, бы ў пустэчы, бы ўва сне,
Валошка чэзлая сярод памерлых душаў,
І сціплы д’ябал крочыць проста на мяне.

***У тваю адсутнасць***
калідорнай пачваркай паўзці па лязе далоняў
і з пакутамі-путамі, словамі-ловамі жыць
ты пякучым праклёнам расцеш у самоце клёна
паглядзі, мы цяпер як крыжы, звар’яцелі дажджы

мы – грыпозныя дрэвы, і лісцяў апалых насоўкі
усцілаюць і лаюць бадзяжны паэтавы шлях
верш, захутаны ў шалік, змяняе пігулкі на золкі
кожным золкам па нас несуцешна галосіць зямля

***Замова***
кожны раз, як сыходзіш сляпы ў павуцінне вулкаў
я ў гаркавым дажджы шукаю сабе прытулку
мне зламаныя пальцы нечы boyfriend цалуе
я крычу праз завею словаў “алілуя”
і пажоўклае лісце ўпадзе зямлі на грудзі
і не ўбачыць яна, як пальцы ламаюць людзі
як тугой абрастаюць радкі, як сівеюць вейкі
як засохлыя дрэвы мне ахвяруюць лекі
ты – далонямі і душой у чужой мярзоце
я – чырвонай травой на здохлай адзіноце
я -- кульгаваю Музай у абадраных строях
ты – нязмушаны дэзертыр з імём героя
твой бяскрылы анёл спакойна падлічыць шнары
пакладуцца ў яго кішэню пігулкі мараў

покуль поўня ваўком штоночы самотна вые
покуль кветкі на падваконні цвітуць жывыя

***Лятунак***
расквітнелі далоні паэткі лятункам жоўтым
мінаком выпадковым здаецца азызлы дзень
як сапраўдны злачынец не мае сваёй згрызоты
так тужлівы малёнак не бачыць сябе ў вадзе
і чакае аблічча свайго шэравокі д'яблік
і апалай лістотай умыўся чырвоны яблык

***Чужынец***
Ты мне чужы. Як першы снег, што хутка тае.
Ты мне чужы, як выпадковыя дажджы,
І кроў мая, сваёй ахвярнасцю святая,
На твой каўнер зусім па-здраднiцку імжыць.
Тваю пятлю з замілаваннем стрэне шыя,
Ды покуль кроў мая дажджыць, хачу дажыць.
Ты мне чужы, бо ўсе табе чужыя,
Бо мне чужыя ўсе, ты мне чужы.

***
Я створана дзеля таго, каб люляць на руках,
Каб лашчыць маўклівага белага шчанюка.
Малітвы свае ахвярую яму. Амін.
Таму, хто заўсёды са мной, хто паўсюдна адзін.
Імкніся спаліць успаміны, як паляць лісты,
Бо ў постаці кожнай, у голасе кожным – ты.
Ізноў, ап'янелы віном і цвярозы віной,
У белым, у дзіўным абліччы прыходзіш за мной.

***
я ў пекле, што хтось неабачліва страціў
я ў пекле, што выпала зь нечай кішэні
з твайго пагляду патроху красьці
па слоўку-сьлязінцы балюча страшэнна
душы і вершу, лязу і скуры
маёй крывёю зіма сплывае
лятункі ў вырай у небе шнурам
і я ў люстэрку яшчэ жывая

***Здрайцы***
заўтра буду грукаць галавою ў неба
шлях наш быў дадому, збочыла ты ў Рым, а
тут перад маімі вершамі ганебна
злосныя анёлы бразнулі дзьвярыма

хлопец лёс свой крэсьліць на счарнелым сьнезе
ён – лязо і сьлёзы, ён – мой кот і кат,
нечым зьнерваваны, заблукалы недзе
некалі сканае на маіх руках

ад цябе таксама лекі не ўратуюць
бо з тваёй талеркі я жыцьцё каштую

***Ня тое***

Я – кропля болю, што паўзе па лязе,
Я – белы зьвер, загнаны ў вусьціш.
Дзяўчаткі вершы выразаюць з газэт,
Маёй крывёй фарбуюць вусны;
Яны забаўляюць сьмерць у крысо,
Ня любяць жабак ды вустрыц,
Падлік пасечаных вядуць валасоў,
Баяцца твараў у люстры.
Сярод прыгнечаных страшэннай красой
Табе – тае, мне – ня тое.
Прадаць дазволена разумным усё,
Усё для дурняў – сьвятое.

***

шчасьлівыя шчасьця нікому ня зробяць
ты дзе, мой каханы, дзе?
пачуцьці свае разьмяняю на дробязь,
каб кідацца імі ў людзей
ня бачна празь белую цемрадзь завеяў
праз шкло захварэлай зімы
сагрэю твае зьледзянелыя веі
гарачымі я сьлязьмі

***Палова***

Ты прыйдзеш, каб сабе забраць сябе
З маіх усьмешак, позіркаў і рухаў,
Ды мне ня трэба напалову скруха,
Ты цалкам мне належыш у журбе.

Ніякіх pro et contra, так ці не…
Вядома, што з табою можа стацца,
Вядома, прыйдзеш ты, каб тут застацца,
Адно тваёй паловы мала мне.

***

Скрозь сьцяну майго маўчаньня
Куляй прабіваецца слова
Гінуць параненыя здані
Ізноў

***

Мы жывем – і, значыцца, мы вар’яты.

***Каляровы верш***

*Ахвярую Т.*

баліць галава балючая галава кепска
быць ёлупам і вызнаваць аптымізм
тут змешчаны аўтабіяграфічныя звесткі
гэта стыль суіцыдальны авангардызм.
адкуль на небе з'явіліся аранжавыя аблокі?
Нашто ўжывала апельсінавы напой!
усё на свеце мае каляровыя вытокі
але толькі не мы але толькі не мы
але толькі не мы з табой.

***Народжаныя ўверсе***

Першы снег на далонях неба паміраў, як кранаўся паветра,
Святыя шматкі маёй мовы каналі ў пачвар на вуснах,
Нікому не здагадацца, што нашы душэўныя нетры
Зліліся ў адзін праклён… Бяжыце па белых трупах.

Самлела зямное вакно ад позіркаў, пахаў і дотыкаў,
Народжаныя ўверсе гібеюць у сноў пад нагамі,
На шкле толькі людзі бачаць выявы бязглуздай эротыкі,
А мы адчуваем -- ткуць словы саё павуцінне між намі.

***П'еса***

П'еса чырвоных мрояў адзінокаму снілася дрэву,
На магіле Паэта кветкі ўзышлі пахілымі крыжамі,
Дрэва мае карэнні, я маю крылы і спевы,
Някепска было б абмяняцца, да зямлі прырасці нагамі.

І я стаяла б нямая, Радзіма б мяне абдымала,
З паперы-зямлі чырвоныя словы цягнуліся б, як кветкі…
Галіны сумнага дрэва крышылі мой твар са сталі,
Мой свет - ягоныя мроі, мой свет - металічная клетка.

***Бездань***

скавытаньне скуголеньне
галашэньне
шмат гукаў пахавала ў сабе цішыня
сумненьне апраўданьне сумленьне
абгрызенае ўяўленьне
растаптанае ўспрыманьне
вершаванітаваньне
складаньне – дзяленьне
памнажэньне
І сьцены.

***

Я ДУРНАЯ
ТЫ ДУРНЫ
І НАШТО НАМ ДЗЕЦІ
?

***Потым***

цуд канфіскаванага дзяцінства
жвавасць недасканалай істоты
кожны з нас зрабіў калісьці свінства
вы бачылі размаўляючыя боты?
вы чулі крокі звар’яцелай цішыні?
трава плача пад нагамі ідыёта
я і мае думкі тут не адны
*гэта слова гэта зараз гэта потым*

* * *

НЕ ПІШЫ
ЧУЖЫМІ РУКАМІ
МОЙ ВЕРШ

***Уяўленне***

Сабака спужаўся поўні
У жыцця пасівелі скроні
Навошта нам ведаць хто
Прымушае расці траву
Але калі я бачу ГЭТА
Схіляюся перад Сусветам
І намаляваны прастор
Уяўленнем ірве галаву…

***Superstar***

Цаглянае цела Пластылінавыя сцены
Брыдкі сталёвы гук удару
Яна ўявіла сябе Пітэрам Пэнам
Чорныя мары Белай ахвяры

Спалі, калі ласка, позіркам, подыхам
Гэты металічны Гук удару
З неба, скінутыя нейкім волатам,
Ляцяць крыштальныя «суперстары»

І разбіваюцца аб яе галаву
Зліваюцца з прыкрым гукам удару
Ёй хацелася ўпасці ў траву
І марыць.

LAMUNKAT.org

***Імя***
трызніла слова Паэтам, як зямля, пэўна,
трызніць травою,
пабачыўшы гэта, зраблюся сабакам і надрыўна
завыю вясною.
сыходзілі чорныя думкі, прыходзілі белыя песні,
я любімае Слова пасаджу на калені, буду доўга
лашчыць і песціць.
падарую Яму сваю кнігу, і не збегла каб – з'ем
Яго крылы,
усё роўна пачварнае сонца немаўлятка маё прапаліла,
і замест брыдкай дзіркі трэба новае скласці Імя.

***Механіка***
Падаруй мне свае новыя вынаходніцтвы,
Я залью іх спірытусам ды аднясу ў музей,
У маёй скарбонцы цудоўныя каштоўнасці,
Бясконцыя каштоўнасці няздзейсненых падзей.

У маім спірце жывуць тваe гойсанні
І бадзянні сярод механічных людзей,
Сярод нелагічнае бессэнсоўнасці...
Да мяне ты заходзіш ўсё радзей і радзей.

***Лесвіца***
лесвіца маёй падсвядомасці
вядзе ў пакой пад страхою
там схаваны: мая памяркоўнасць
пыльныя лялькі і мроі

там шматкі чырвоных шпалераў
помняць гісторыю сценаў
і жывуць вымярэнні старажытных кватэраў
аскепкамі маіх спеваў
маіх таямнічых спеваў

***Image***
Nie čakaj mianie na hetaj nieviadomaj
sumnaj vulicy biaz nazvy,
Ja źnikaju razam z ułasnymi śladami
na błakitna-ružovym śniezie,
Patanajučy ŭ tvajim kubku siarod chvalaŭ
fijaletava-čornaj kavy,
Ja kaliści prasiła ab litaści: "Nie častuj mianie
pryjemnymi słovami.Bolš nia lezie."
Moŭčki siedziačy na tvajoj ciopłaj, łahodnaj daloni,
śniažynki, napeŭna,
Tabie achviarujuć svaje dušy, nia dumajučy
pra pakinutuju čornuju isnaść,

KAMUNIKAT.org

I drevy schilajuć hałovy pierad podźviham mužnych…
U čatyroch ścienach,
Prabivajučy mocaj pačućciaŭ vakno, ja ŭ toj čas
praklinaju svaju ciažkakryłaść.

***Chvilina***
Nie zabivaj cišyniu
Jana žyvie nie adnu
Chvilinu

***Biezdapamožnaść***
Ty zrabiŭ mnie baluča
Papraknie ciabie ŭśled cišynia
ale nia ja

***Addanaść***
Paklič miane, jak niemaŭlatka kliča maci,
Zaplušču vočy, vylju ślozy j pryjdu.

***Pasłuchaj***
Pašukaj moj zabłytany pozirk
Ja chaču padaravać tabie nieba
Ja chaču achviaravać tabie žyćcio
Ad majho sumu knihi robiacca pyłam
Ad majoj samoty słovy łajucca na papieru
Mahčyma heta adčuvaje kožny
Ale nia kožny zdolny
Padaravać tabie nieba
Achviaravać tabie žyćcio
Pasłuchaj

<table>
<tr><td></td><td></td><td></td><td>д</td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td>з</td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td>і</td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td>ц</td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td>я</td></tr>
<tr><td></td><td></td><td>к</td><td>ч</td></tr>
<tr><td>м</td><td>о</td><td>р</td><td>а</td></tr>
<tr><td>а</td><td></td><td>ы</td><td>й</td></tr>
<tr><td>р</td><td></td><td>в</td><td></td></tr>
<tr><td>у</td><td></td><td>і</td><td></td></tr>
<tr><td>д</td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>н</td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>а</td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>е</td><td></td><td></td><td></td></tr>
</table>

***Паданне***
У прыгожай краіне, створанай з пылу і бруду,
Дзе, як кажуць паданні, сыходзіцца клінам наш свет,

Не бывае ніколі ні святаў, ні казачных цудаў,
Толькі дзіва – там кожны жабрак і там кожны паэт.

Вершы паляць, як восенню лісце, попел робіць імгненне,
А з імгненняў раз'юшаны вецер складае гады,
Праз стагоддзі блукаюць паэтаў ледзь бачныя цені,
Словы лісцем барвовым на зямлі пакідаюць сляды.

***Сумленне***

Пафарбаваныя ўсмешкі ляцяць на мяне з вашых твараў, як кроплі дажджу з неба ўвосень. Забярыце іх сабе, я не карыстаюся грымам, не ўжываю рэшткі чужога сораму. Я кожную раніцу, адчыняючы вакно, бачу, як выкідаеце вы праз форткі сваё сумленне.

***Апошні***

Твой першы, як мой апошні,
І зноўку ўсмешка поўні,
І смак у паветра горкі…
Хадзем,
пахаваем забітыя зоркі.

Дзіўна, ты ведаеш, як,
У завулку крадзецца маньяк,
Толькі не ведаеш, пра што…
Бачыш,
яго цень ліжа нашу століь.

***Жудасьць***

У тваіх вачах палае нямая адзінота
Калі я гляджу на цябе, мне робіцца страшна
Нібыта свет апанавала ўнутраная слота
Нібыта жудасьць точыць кіпцюры апантана

Аб нашыя душы, мой здраднік-дружа,
Аб нашыя думкі, якіх не было й ня будзе
Шукаеш, узіраешся ўдалячынь напружана
Красавік сакавік люты студзень

***

Я карыстаюся сьляпымі й куцымі словамі
з сябе я шукаю выйсьця
хістаючыся, яны з адсечанымі галовамі
кладуцца на паперу, як барвовае лісьце

Сплываюць крывёю, набываючы новыя формы
мае вершы – магілкі выкшталцоныя
пазяхаючы, заплюшчыўшы вочы ад стомы
я выцягваюся на ложку, прадчуваючы бяссоньне

***Пластылін***
Вершыкам хочацца спаць – пластылінавыя літары
Зусім не балючы летаргічны сон у лядоўні
Тым часам нехта ўжывае каву літрамі
Ад залішняй геніяльнасці сівеюць скроні

***
мацнею пад лязом сякеры
я не для вас, паны, о не:
не мне ў вас такіх паверыць,
не вам паверыць у мяне.
сплываючы крывёй нябёснай,
спяваючы санет чужы,
каб у вачах блакітных слёзна
схава́ць чырвоныя дажджы.
не знае ваша літасць меры.
ў жыцці, як у чароўным сне,
мацнею пад лязом сякеры.
я не для вас, паны, о не.

***РУХ ЧАСУ***
Апошнія хвіліны сцякаюць па маіх скронях
Упершыню я адчуваю, як рух валодае часам
Вершаваная іржа пануе ў срэбных мроях
Мяне зразумець складана – застанься са мною сам-насам
Магчыма, боль дадасць моцы тваім дыстрафічным крылам
Шчырым пафігізмам прасякнутая іронія
Прымушае мой фотаздымак пакрывацца сумам і пылам
Апошнія хвіліны сцякаюць па маіх скронях

***КАЛЫХАНКА***
Сьціплы бог паглядаў адрачона, як сьпіць чалавек,
Сьціпла падалі вейкі з заплюшчаных шчасьцем павек,
Поўня бляклаю плямай на чорнай цьвіла прасьціне,
І зьліваўся з асфальтам нікім ня спынены сьнег.
І блукалі балесныя сны, наводзячы жах,
Ды бадзяліся псэўдаегі па нажах.
Падавалася: толькі ты ніяк не засьнеш,
Гэтаксама, як нікім ня спынены сьнег.

***У САМОЦЕ***
на тваіх далонях узрасьлі расьлінкі
прыклаўшы да іх вуха пачуеш крыкі
крануўшы пальцам атрымаеш раны
яны выкрываюць чалавечыя заганы
але я імкнуся (гэта значыць даб'юся)
у самоце, у нябыце, у тузе, у скрусе,
у глыбакосьці, у жудасьці

узрасьці
на чырвонай зямлі з чорнай скурай
*дурань дурань дурань*

***HSYAOD***

Самотны чалавек! Глядзі, з дрэваў сцякае блакітная кроў,
Кроплі збягаюцца ў велізарныя лужыны,
Нечая постаць, скурчаная пад нападамі чырвоных звяроў,
Ад адчаю і болю кожны мускул нервова напружаны.

Самотны чалавек! Назіральнікі, падобныя да мармуровых сценаў,
Пазбаўленыя не толькі пацыфісцкіх ідэй,
Дый у брудных лужынах хіба не нашыя цені
Яшчэ ўчора казалі:"Hope to see you again one day"?

***МАЛІТВА***

неба перапэцкала свае далоні ў атруце
накрапала смярдзючай вадкасцю на твар
дрэва білася галавой аб зямлю ў скрусе
пазбаўляючыся разам з лістотай вычварных мар

растапчу свае думкі раскіданыя па падлозе
расплюшчаныя вочкі – калодзеж непаразумення
гэй той хто сядзіць у нябёснай бярлозе
падары сваім гадам хаця б трошачкі сумлення

***СПОВЕДЗЬ КУЛЬГАВАГА ЦЕНЮ***

мой кульгавы цень ідзе па сцяне
кожны ягоны рух нараджае боль
мяне адлюстравала нябёсная столь
дый ты – гэта ўсё, што ёсць у мяне
праўда паэта патанула ў віне
як сонечнае лета ў крывавых аблоках
як белыя шпалеры ў адбітках крокаў
дзе мой кульгавы цень ідзе па сцяне

***КАНСТАТАЦЫЯ МАЁЙ АДСУТНАСЦІ***

чэзлыя кветкі словаў тваіх
трупянеюць на стракатых шпалерах
шляхам сваёй непаўторнасці псіх
сцвярджае мудрагелістасць веры
у сваёй адзіноце я станую першай
калі ў вочы твае заглыбіцца жаль
калі кнігу сваіх акрываўленых вершаў
я цвікамі прыб'ю да крыжа

***СПЯКОТАЙ АПАЛЕНАЯ СКУРА***

блакітнавокія вершы з залатымі вейкамі
робяцца ўва мне высакагорнымі рэкамі

істоты з апаленай скурай
у небе цягнуцца снурам
і кожны дотык паветра гарачы
працінае цела чырвоным плачам
сонца сляпога ахвяры
на зямлі барвовеюць шнары
схіляюцца дрэвы ў самоце
молячыся спякоце

***НА КАЛЯДЫ***
у вялізным насценным люстры
я ўбачыла цень заратустры
сны спаўзаліся мне на плечы
ад сябе так няпроста збегчы
*а паэту не трэба многа*
*толькі стаць невялічкім богам*
у ягоным цяжкім дыханні
стогне боязь мяне параніць
мысляры ля святочнай елкі
патаналі ў моры гарэлкі
родных вуснаў святая здрада
нараджэнне святла. Каляды

***АТРУТА***
нечы сум пазірае тваімі вачыма
кожны дзень я праходжу няшчасцяў міма
і за вейкі чапляюцца нечыя слёзы
дзіўна! срэбныя дрэвы глядзяць несур'ёзна
гэты дзень з шакаладным салодкім смакам
я скармлю бадзяжным калматым сабакам
на маёй маленькай далоні знову
застанецца атрутных некалькі словаў

***ПОСТТРЫЯЛЕТ***
пачвара з задуменнымі вачыма
угледзела самоту за вакном
ад скрухі трэба лекавацца сном
пачвара з задуменнымі вачыма
на дне азёр, напоўненых віном,
схавалася цвярозая радзіма
пачвара з задуменнымі вачыма
угледзела самоту за вакном

***НЕВЫНОСНАЯ ЗДРАДА***
снег чырвонаю здрадай цалуе брудны асфальт
невыноснаю здрадай пакрыліся дрэвы і вуліцы
у зімовым паветры іскрыцца дзівосны баль
і вяртаюцца пчолы ў свае бетонныя вуллі
толькі ты не спяшаешся жыць да такога скону

KAMUNIKAT.org

небасхіл чакае з'яўлення апошніх зорак
на далонькі мае згодна з нечым вечным законам
упадзе забіты табой аксамітны золак

***

знайдзі мяне сярод забытых рэчаў
зляпі мяне з няшчасцяў і пустэчы
і я прыйду, і сціхне ўсё наўкола
і я прыйду, і зноў замкнецца кола
ды зразумець у зацемках няможна
ці гаспадар ты ёсць, ці падарожны

***ЗЯМЛЯ АНЁЛАЎ І САМАГУБЦАЎ***

стаю на даху, гляджу ў далеч
застылы водгук былой вайны
мы - дзеці, зробленыя са сталі
мы – проста сны

як заінеюць мае павекі
шалёны крык падштурхне мяне
паміж душою і чалавекам
крывавы снег

ва ўлонне маці змагу вярнуцца
зямлі спакутаваным дзіцём
вучыць анёлаў і самагубцаў
любіць жыццё

***ВЯЗНІ***

як вязні некалькіх прыступак
нясмела прыпыняем крок
нябёсы ахінае смутак
нябёсы абдымае бог
калі бяжыш, не спатыкніся
сляды на травеньскай траве
пакуль са мной жыве ў кнізе
самотны верш

***

сны да аранжавай падушкі
схіляюць лысыя галовы
хутчэй ратуйце нашы душы
*мы –носьбіты нічыйнай мовы*
я – цень, што поўзае па сценах
да вуснаў прыпадае моўчкі
і пазіраюць летуценна
напаўрасплюшчаныя вочкі

KAMUNIKAT.org

***

Квітнее сонца. Хочацца спяваць.
Праз неба прабіваюцца дажджы.
На пальцы праліваецца трава,
І нават нежывыя прагнуць жыць.

Паэтка крэсліць словы на вакне,
Паэтка на вясну глядзіць праз шкло.
Хаваецца ў вачах расталы снег.
Паэткі ў гэтым свеце не было.

***

*Ты пакліч мяне, пазаві.*
*Я.Янішчыц*

Ты ня кліч мяне, не заві
Памаўчы, зямля,
Зарасьце павуціньнем травы
Лёгкіх крокаў шлях
Паляцець на калючы дрот
Болем сьвет спавіць
Апячы брыдкім крыкам рот
Не мяне заві

***Безгаловы санет***

Ня плачце... Не таму, што слёз шкада
Бо не ад іх трава расьце вясною
Узрошчаная сном і цішынёю
Сьцякае зь веяў марная вада

Ня будуць болей сонечныя промні
Ружовыя ад шчасьця і ад стомы
На шчоках палымнець расталым сьнегам

**Ня плачце**. Усьміхаюся балесна
Я **не таму, што** хутка стану небам
Мне **сьлёз шкада**, якім у зрэнках цесна

***ІДЫЁМА ІДЭАЛА***

на зімовае сонца вочы прымружыўшы
прапускае святло ў душу праз сінія зрэнкі
чарнавокі спадар што імкнецца сябе сагрэць
ён бялейшы за першы снег і крылы анёлаў
я гляджу на яго і моўчкі кусаю вусны
толькі хто вінаваты, мой любімы колер – чырвоны
устрывожаны ранак птушкай сарваўся з галіны
дай пад'есці свабодзе трошкі апалага лісця
дайце мне пад'есці трошкі вашай свабоды
маё сэрца стане вялікім як гэтыя вочы

***ГЕРОІ МАІХ СУСВЕТАЎ***

1

я адчуваю сябе героем свету
сонца тваё падобнае на манету
маё – на канцэнтрацыю крывавых кропель
пакаштуй майго салёнага сіропу
слязлівыя дзяўчыны глытаюць кветкі
яны – усяго толькі вантробы вялізнай клеткі

ешце, бессаромніцы, частуйцеся,
іначай не атруціцеся!
дрэвы замяняюць паэтам сяброў
ды астатнія на віно змяняюць кроў
вы, ахвяры валтузнёвай мітусні!
вы, стваральнікі трызненняў і фігні!

хто дажыве да наступнага лета
той праглыне сусветную катлету
я не імкнуся змагацца з лайном і брудам
не станецца чараўнік імітатарам цудаў
я буду Іудам у наступным жыццёвым сне
я радзіму прадам за семнаццаць срэбных манет

2

ты не ведаеш беларускай мовы
напладзілася вакол словаловаў
па старонках маршыруюць папяровыя шкілеты
мы пра тое, пра святое, вы пра вечнае, ПРА ГЭТА!
вы, нахабныя пахавальнікі й каты,
адшукаць бы атруту для вашай гарбаты!

задыхнуўшыся ад сонечных ванітаў
ідыёты рыхтаваліся да іспытаў
а на нашыя галовы няшчадна пляваліся хмары
а пад нашымі ботамі кожнай травінцы хацелася марыць
я не стану пытацца, дзе твае бадзяюцца цені,
бо святога ад забойцы складана адрозніць па адзенні

што існуе знутры? гармідар пачуццяў?
твой голас у зарасцях болю зусім не чуцен
выключна пафас, раздзьмуты на хлуслівай паперы,
дасягае неверагодных памераў,
дзе кожны будзе лічыцца героем свету
тваё сонца падобнае на дзіравую манету

***ПАТРЫЯТЫЧНЫ ТРЫПЦІХ***

1

раскоша ў вясковым садзе
зліліся ў маім паглядзе
жанок залівістыя спевы
і жоўты яблык пераспелы
што зараз ападае долу
накшталт яго хачу на волю
прыгожы твар сканае збітым
я ж рызыкую быць забітай
сябе паводзіць трэба ціха
бо мне няма дазволу дыхаць
дуб беражэ сваё карэнне
палаю, стоячы на сцэне
мацнее пад лязом сякеры
я – скурчаны шматок паперы

2

панк, валацуга і эстэт
насраць хацеў на цэлы свет
ці доўга жыць мы будзем з вамі
калі на Свіслачы – цунамі?
свет адыграў чужую ролю
паэт павесіўся ад болю
свет ванітуе ад напасцяў
паэт застрэліўся ад шчасця
не, не пустыя напалову
дурныя нашыя галовы
мы пераблыталі ў цемры
імёны, твары і манеры
Свабоды, Роўнасці і Веры...
я – скурчаны шматок паперы

3

калі пад полымем штандараў
мы пазбаўлялі сэрцы шнараў
зямля плявала нам у вочы
лямантавала, якія мы сволачы
не запавольваючы хады
забойцы трушчылі гарады
пустыя вуліцы і дамы
казалі пра тое, што гэта – мы.
бразгала восень дзвярыма і вокнамі
дрэвы кідаліся сшыткамі нотнымі
спявалі "Магутны Божа"
каб светла было й прыгожа
ад ліхаманкі й даверу
скурчаны стос паперы

***НАЗАЎЖДЫ***

Пухіры блакітна-празрыстых вачэй Мяне няма
Дзве кроплі патанаюць адна ў адной
Калі неба злучаецца з зямлёю – утвараецца турма
Не ірвіся з сусветнай клеткі Застанься са мной

Самотныя твары дрэваў Ні дзень ні ноч
Дождж Што ён бачыць у глыбінях чырвонай вады?
Штодзённасць шэра-плямістых сноў Ізноў
Неіснуючы сябра Застанься са мной Назаўжды

***СПУСТОШАНАСЬЦЬ***

зямля апусьціла цяжкія павекі
дрыжаць у паветры танюткія вейкі
рыхтуй для мяне антысонныя лекі
бязглузды спакой – нішто для нас

адчуючы ветру засьмяглы подых
чужых валасоў сьветларусых слодыч
блукае па віхлястых бясконцых сходах
спустошанасьць

***Белы попел***

я бегла па вясне, і плакаў боль
апалаю чаромхай на траву
імкнуўшыся ўвесь свет прыкрыць сабой
мне белы попел лёг на галаву
у зрэнках стомленых квітнее бэз
пустое зерне хутка прарасце
ці ёсць магчымым забіваць сябе
каб быць крывёю на чужой красе

**Эсэ № 7**

Колькі каштуе твая засьпіртаваная душа? Я набуду яе зь вялікім задавальненьнем для таго, каб праводзіць філялягічныя экспэрымэнты. Алькаголь не ўратуе ад болю, таму твая сутнасьць будзе адчуваць кожны пяшчотны дотык майго адвечна ненажэрнага пінцэту. Штодзень я буду праводзіць невялічкія апэрацыі. Мае асыстэнты – твае сябры. Я ня помсьлівая, але справядлівая. Высакароднасьць вышэй за ўсё – калі цябе гэтаму не навучылі, прыйдзецца ўводзіць падобны панятак ў тваю падсьвядомасьць мэханічна. Я паэтка, але не хірург, прычым хутчэй прыродная нахабніца, чым штучная графаманка. Празь некалькі год зь мяне будуць выдаляць прагу велічы. А пакуль што мы зоймемся высьвятленьнем твайго дыягназу, сьветлы мой і непахісны.

***

да цемры цяпер праз церні
ад жыццяў цяпер праз жыта
з пакорай цяпер у мора

KAMUNIKAT.org

без веры пад суд сякеры

на золку збірайма зёлкі
пад вечар збірайма веча
з-за кратаў збірайма катаў
мне зранння спяклася рана

*На Вялікдзень*
тое, што скажу яму
тое, што скажу табе
ўсё – трагедыя Муму
між табой ды ім прабел
бо які ж у вершаў смак,
гатаваных на крыві?
штосьці з іх я з'ем сама
рэшту вып'е красавік
твой ад шчасця светлы твар
нараджаецца трава
славіш Вечнасць і Красу
Твой са мною Страшны Сум
Я – працятая наскрозь
І напраўду, Ты ўваскрос

***
Я склала зброю. Стаптала боты.
Зламала кіпці. Пайшла дадому.
Бо хто шчаслівы, бо хто журботны
Адчыніць дзверы майму малому?
Дзяліўшы, рэзаў мяне на вершы,
Не знаўшы, шкодзіў сабе самому,
Праз колькі дзён безгаловы вершнік
У дом, бы котку, запусціць стому.
Лязо далоняў
Вастрыла сёння
Паслала сон на
Паслала ўсё

***Быцьцё***
сьцякала па вопратцы кроў
начных навальнічных вятроў
я ўсіх прадчувала нутром
героі ўжывалі ром
гуляліся ў лябірынце
каналі ў бінтах і быце
ня бойцеся і забіце
на зайздрасьць і злосьць забудзьцеся
а ты падстаўляеш шчаку
сьлязою па ёй сьцяку
і мне дастануцца ад скрухі

KAMUNIKAT.org

тваe ап'янелыя рухі
тваe зьледзянелыя рукі
і рызыкі-выбрыкі-крыкі
твой сон у маю галаву
сьмерць блізка, лаві love you

KAMUNIKAT.org